# У МЗС адзначылі 200-годдзе з дня нараджэння Станіслава Манюшкі

18.12.2019 18:19 | Аўтар: Марыя Дадалка | Культура, Музыка

**Бягучы год афіцыйна аб'яўлены ЮНЭСКА годам кампазітара, а юбілей уключаны ў Спіс памятных дат арганізацыі на гэты год.**



Фота studentportal.pl

На святочнай цырымоніі прысутнічаў міністр замежных спраў Беларусі, старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА Уладзімір Макей.

Імпрэза завяршае план мерапрыемстваў ( іх было каля 70), падрыхтаваных ведамствам з нагоды юбілею.

Па словах міністра, уключэнне даты нараджэння кампазітара ў спіс свят ЮНЭСКА сведчыць аб тым, якое значэнне мае яго імя для сусветнай культуры.

> *«І такіх імён, як Станіслаў Манюшка, ў нашай гісторыі нямала. Мы можам назваць і Адама Міцкевіча, і Ігнація Дамейку, і Кастуся Каліноўскага, і Тадэвуша Касцюшку, і многіх іншых. Яны належаць не толькі нашай гісторыі. І з улікам таго, што наша гісторыя вельмі складаная, ім даводзілася жыць у розных мясцінах, нават у розных дзяржавах, і яны належаць нашай агульнай спадчыне, належаць спадчыне суседніх народаў. Не трэба дзяліць і прысвойваць і Станіслава Манюшку, і Адама Міцкевіча, і таго ж самага Кастуся Каліноўскага камусьці аднаму, якойсьці адной дзяржаве. Яны нашы, агульныя»*, — сказаў Уладзімір Макей.

На яго думку, агульная спадчына з'яўляецца мовай міжнацыянальных зносін, даступнай і зразумелай усім, падмуркам для міжкультурнага дыялогу, эфектыўным інструментам для развіцця стратэгічных добрасуседскіх адносін на будучыню.

Станіслаў Манюшка нарадзіўся, вучыўся і зрабіў першыя крокі ў музыцы ў Беларусі, першыя буйныя творы падрыхтаваў на тэрыторыі сучаснай Літвы, росквіт творчасці кампазітара звязаны з Польшчай. Часовы паверчаны ў справах Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Вайцэхоўскі адзначыў: у гэтым годзе ў нашых краінах адбылося некалькі соцень мерапрыемстваў, прысвечаных Станіславу Манюшку. «Дазвольце падзякаваць за тое, што мы ўмеем дзяліцца Манюшкам у найлепшым разуменні гэтага слова. І кожная з нашых дзяржаў лічыць яго ў пэўнай ступені сваім. Гэта не ўсім падабаецца, але, ўлічваючы біяграфію кампазітара, у нас няма іншага выбару», — падкрэсліў прадстаўнік польскай дыпламатыі.

Арганізатарамі мерапрыемства разам з МЗС выступіў Нацыянальны гістарычны музей, які падрыхтаваў выставу «Станіслаў Манюшка. Падарожжа ў XIX стагоддзе». Адкрыццё гэтай выставы і прэзентацыя віртуальнага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Станіслаў Манюшка. Музыкальны рамантык з Міншчыны» адбылося падчас цырымоніі.

**Марыя ДАДАЛКА**

## Чытайце таксама

- **Апошні трэк-ліст Алега Молчана**
- **У Рызе прайшоў першы Конкурс беларускай песні Латвіі**
- **Чаго чакаць на XXXII Міжнародным фестывалі «Студзеньскія музычныя вечары»**
- **Беларускі гурт J:Морс выступіў у ААН**
- **Беларуска Ліза Міснікава выступіць на дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2019» сёмай**

Тэгі: музыка | Станіслаў Манюшка
132 прагляда | Друкаваная версія
Падзяліцца:

Навіны | Папулярнае
11:25 Дональду Трампу абвешчаны імпічмент
10:41 Двое брастаўчан зараблялі шляхам крадзяжу каляровых металаў
09:52 Гасцёўня Уладзіслава Галубка запрашае акунуцца ў свет казак
08:35 "Белтэлекам" закрыў доступ да сэрвісу "Інфармацыйны партал"
08:16 Прагноз надвор'я на 19 снежня
УСЕ НАВІНЫ

Іншыя матэрыялы аўтара
Беларусь і Турцыя абмяркоўваюць магчымасць водных зносін па рацэ Дняпро
Прэзідэнт патрабуе максімальную аддачу ад кожнага ўкладзенага ў эканоміку рубля
Пераможцаў конкурсу ініцыятыў па падтрымцы прадпрымальніцтва ўзнагародзілі ў Мінску
Беларусі і Татарстану трэба шукаць новыя пункты росту тавараабароту
Прэзідэнт В'етнама запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць

## Выбар рэдакцыі




Герагог з Германіі расказала аб новых формах работы з пажылымі

Сафі Фоетс-Ханэ з нямецкага горада Дзюсельдорфа працуе з пажылымі людзьмі ў якасці

0 | 173




Старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш Стружэцкі: Краязнаўства — справа кожнага

Беларускі фонд культуры — адна з найстарэйшых грамадскіх

0 | 149




Якія распрацоўкі маладых вучоных хутка з'явяцца ў нашым жыцці?

Яны прадстаўлены падчас адбору для ўдзелу ў фінальным этапе праекта «100 ідэй для Беларусі».

0 | 138




Як вярнуць вугра дадому?

Чаму ў Беларусі знікае рэдкая рыба.

0 | 281



© 1998—2019 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.
Создание сайта webxayc.by